ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 19 (776) ● Пятніца, 22 мая 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

**У МАСКВЕ, У КРАМЛЁЎСКІМ ПАЛАЦЫ З'ЕЗДАЎ, 26 МАЯ ПАЧНЕ РАБОТУ XVI З'ЕЗД ВЛКСМ. У РАБОЦЕ З'ЕЗДА КАМСАМОЛА ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ 4.695 ДЭЛЕГАТАЎ—АМАЛЬ НА 1.000 БОЛЬШ, ЧЫМ УДЗЕЛЬНІЧАЛА Ў XV З'ЕЗДЗЕ.**

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

● З вялікай цікавасцю праходзіць у групах, на курсах і факультэтах абмеркаванне Звароту Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза да выбаршчыкаў, у якім падведзены вынікі гераічнай працы савецкіх людзей ад мінулых да цяперашніх выбараў.

● У пярвічных партыйных арганізацыях пачаліся справаздачы і выбары. 20 мая яны адбыліся на фізічным, юрыдычным і біялагічным факультэтах. Праходзяць і рыхтуюцца такія сходы і ў іншых арганізацыях.

● Супрацоўнікамі бібліятэкі аформлена выстаўка-стэнд, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння Хо Шы Міна.

● Штогод 24 мая ў братняй Балгарыі шырока адзначаецца Дзень балгарскай культуры, асветы і славянскай пісьменнасці, устаноўлены ў памяць вялікіх славянскіх асветнікаў Кірылы і Мяфодзія.

Гэтае свята адзначаецца і калектывам нашага універсітэта. Яму прысвячаюцца даклады, гутаркі, вечары.

● У гэтыя дні ў нашым універсітэце знаходзіцца загадчык аддзялення геаграфіі філасофскага факультэта Люблянскага універсітэта доктар Марыян Жагар. Для студэнтаў геафака ён чытае лекцыі: «Фізічная геаграфія Славеніі», «Фізіка-геаграфічны агляд Югаславіі», «Турыстычная геаграфія».

Марыян Жагар мае намер наведаць цікавыя для турыстаў мясціны Беларусі з тым, каб пасля разам з дэканам геафака М. Т. Рамановскім падрыхтаваць кнігу па турызму Славеніі і Беларусі.

● Адпаведна дагавору паміж братнімі універсітэтамі на трохтыднёвую практыку ў Балгарыю і Венгрыю адпраўляцца дзве групы студэнтаў геафака на чале з выкладчыкамі кафедр фізічнай і эканамічнай геаграфіі зарубежных краін.

З той жа мэтай Беларусь наведаюць студэнцкія групы з гэтых краін.

## КАФЕДРА — УДЗЕЛЬНІЦА ВДНГ

У гэтым годзе сярод удзельнікаў Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі у Маскве мы убачым кафедру гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў універсітэта, якую узначальвае прафесар Ус. М. Сікорскі. Вопыт яе работы прызнан дастойным шырокай папулярызацыі і вывучэння.

Калектыў кафедры дабіўся вялікіх поспехаў, разгарнуўшы актыўную падрыхтоўку да ленінскага юбілею, здолеў падняць на больш высокую ступень вучэбную, метадычную, выхаваўчую і прапагандысцкую работу, дасягнуў плённых навуковых вынікаў. Клапоцячыся аб творчым засваенні студэнтамі гісторыі партыі, члены кафедры звярнулі асаблівую увагу на павышэнне навукова-тэарэтычнага узроўню лекцыйных і семінарскіх заняткаў, увялі ў практыку сістэматычную праверку студэнцкіх канспектаў ленінскіх работ, арганізавалі запіс на магнітафонную плёнку 15 кансультацый па найбольш складаных і актуальных пытаннях.

Глыбінёй выкладання, багаццем матэрыялу вызначаюцца лекцыі прафесараў Ус. М. Сікорскага, М. Я. Шкляра, І. М. Ігнаценкі, А. Я. Журава, дацэнтаў З. Г. Грыгор'евай, І. О. Царук, А. М. Малашкі, на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні вядуць семінарскія заняткі старшыя выкладчыкі М. А. Пашкевіч, Т. К. Калеснікава, дацэнт Е. А. Васілеўская, асістэнты Я. Л. Прыбыткова, Г. С. Асташонак.

Вялікую ўвагу удзяліла кафедра выкрыццю буржуазных фальсіфікатараў гісторыі КПСС, ленінскай ідэйнай спадчыны. Аб навейшых фальсіфікатарскіх прыёмах былі зроблены даклады і паведамленні, для студэнтаў першага і другога курсаў уведзен спецкурс па крытыцы буржуазнай ідэалогіі.

З мэтай аказання дапамогі выкладчыкам у больш глыбокім асвятленні ленінскай тэарэтычнай спадчыны на кафедры сістэматычна абмяркоўваюцца тэксты лекцый.

Праведзена вялікая работа па распрацоўцы новых спецкурсаў і спецсемінараў на гістарычным факультэце.

Вялікі інтарэс уяўляе навукова-даследчая дзейнасць кафедры. Выконваючы абавязацельства, узятае ў гонар ленінскага юбілею, гісторыкі партыі універсітэта сумесна з прадстаўнікамі іншых вну Мінска падрыхтавалі упершыню ў рэспубліцы «Курс лекцый па гісторыі КПСС» для студэнтаў універсітэтаў і гуманітарных вну Беларусі. Выйшла ў свет манаграфія І. О. Царук «КПБ — арганізатар культурнага будаўніцтва ў Заходніх абласцях Беларусі». У выдавецтве БДУ рыхтуюцца да выпуску манаграфіі аб арганізатарскай рабоце партыі ў вёсцы ў 1918—1919 гадах (аўтар Д. П. Жмуроўскі), аб афармленні аднапартыйнай сістэмы дыктатуры пралетарыяту ў СССР (А. М. Малашка), аб выкарыстанні мастацкай літаратуры ў курсе лекцый па гісторыі КПСС (А. Я. Жураў) і іншыя. Па лініі таварыства «Веды», у выдавецтве «Высшая школа», «Беларусь» апублікаваны работы тт. Сікорскага, Шкляра, Журава.

Сістэматычна члены кафедры выступаюць у часопісах «Камуніст Беларусі», «Полымя», у газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Мінская праўда», па радыё і тэлебачанню.

Толькі ў 1969 годзе навуковую прадукцыю кафедры склалі 19 работ аб'ёмам каля 60 друкаваных аркушаў.

А лектараў-прапагандыстаў з гэтага калектыву ведаюць самыя шырокія колы грамадскасці рэспублікі. У мінулым годзе, напрыклад, на грамадскіх пачатках было прачытана больш 200 лекцый і дакладаў. Члены кафедры выступілі ў рэспубліканскіх ленінскіх чытаннях. А. Я. Жураў выязджаў для чытання лекцый па ленінскай тэматыцы ў Польскую Народную Рэспубліку, Ус. М. Сікорскі — у ГДР.

Вопыт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў выйшаў за межы універсітэта. Цяпер з ім пазнаёмяцца зацікаўленыя людзі з розных раёнаў краіны. А ў сябе дома, трэба спадзявацца, ён стане здабыткам кожнай кафедры, бо мае многа карысных кампанентаў неспецыфічнай уласцівасці, вартых пераймання.

**А. АЛЕНІЧ.**



**На здымку:** ідзе чарговае пасяджэнне кафедры.

**Фота Д. ПРЭСА.**

*25 мая—Дзень вызвалення Афрыкі*

## СВАБОДААЮБІВЫ КАНТЫНЕНТ

Гаворачы аб маладзёжным руху на Афрыканскім кантыненце, я спыню сваю ўвагу ў асноўным на двух пытаннях: унутраныя умовы работы і знешнія сувязі афрыканскіх маладзёжных арганізацый.

У недалёкім мінулым Афрыканскі кантынент уяўляў сабой калоніі розных краін: Англіі, Францыі, Бельгіі, Італіі, Партугаліі. Таму невыпадкова, што першай і галоўнай задачай, якая паўстала тады перад народамі кантынента, была барацьба супраць каланізатараў, барацьба за свабоду і незалежнасць. Гэтая задача з'яўляецца злабадзённай і цяпер для некаторых краін Афрыкі.

У сувязі з канкрэтнымі гістарычнымі умовамі гэта барацьба не была аднолькавай па форме для усіх маладзёжных арганізацый краін Афрыкі, не праходзіла усюды аднačасова. Але канчатковая мэта была, безумоўна, адна: свабода.

Я хачу падкрэсліць, што дабіцца гэтай мэты было вельмі складана. Цяжкасць заключалася ў тым, што прадстаўнікі краін, якія заняволілі нашы дзяржавы, у правядзенні сваёй палітыкі эксплуатацыі абапіраліся на сваю сілу, прымяненне якой супраць карэнных жыхароў было узаконена. Яны парушалі самыя элементарныя правы нашых народаў: права на працу, адукацыю, медыцынскае абслугоўванне. Не маючы нават пачатковай адукацыі, асноўная маса насельніцтва ў Афрыцы была пазбаўлена права на кваліфікаваную працу.

Становішча жанчыны было настолькі бяспраўным, што тады, ва умовах каланіяльнага панавання, не магло быць і гутаркі аб нейкіх свабодах для яе, тым больш, каб паставіць яе на адзін узровень з мужчынай.

Нават тыя правы, якія мы атрымалі ад каланізатараў — напрыклад, свабода перамяшчэння для грамадзян краіны, — былі абмежаваны. Паўднёвая частка Судана была закрыта для насельніцтва поўначы. Жыхары, якія парушалі гэты закон і пераходзілі з адной часткі краіны ў другую, неслі крымінальную адказнасць і падвяргаліся пакаранню.

Натуральна, каланізатары, якія мелі ў сваіх руках і заканадаўчую, і выканаўчую уладу, кожны рух у любым маштабе, які насіў антыкаланіяльны характар, разглядалі як злачынства. Кожны чалавек, які узнімаў свой голас у абарону праў, лічыўся злачынцам. Часам дастаткова было выступлення аднаго чалавека для таго, каб каланізатары пасадзілі за краты сотні іншых.

Беспадстаўнаму арышту часцей за усё падвяргаліся прагрэсіўныя дзеячы розных партый, прафсаюзных і маладзёжных арганізацый. Галоўная сіла каланізатараў была накіравана заўсёды супраць кіруючых кадраў руху Супраціўлення.

Але, нягледзячы на гэта, барацьба працягвалася і з нарастаючымі тэмпамі працягваецца цяпер. Яшчэ не вызваліліся ад ярма каланізатараў народы Паўднёвай Радэзіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Партугальскай Гвінеі і іншых краін.

Нашы народы заўсёды разумелі, што свабода даецца ва упартай барацьбе з каланізатарамі, яна можа быць толькі заваявана. На гэта неаднаразова указваў правадыр міжнароднага пралетарыяту У. І. Ленін у сваіх работах. Практыка не раз пацвярджала правільнасць ленінскіх указанняў.

Такія, у асноўным, тыя умовы, у якіх узніклі і дзейнічалі шматлікія маладзёжныя арганізацыі. Спачатку неабходна было арганізаваць моладзь, падняць яе на барацьбу. Гэта быў першы этап развіцця маладзёжнага руху.

Пасля палітычнага вызвалення усе сілы трэба было накіраваць на вырашэнне эканамічных цяжкасцей, на падрыхтоўку сваіх нацыянальных кадраў — маладых спецыялістаў: інжынераў, урачоў, выкладчыкаў, тэхнікаў і г. д. У рашэнні гэтых задач мы заўсёды прызнаём вялікую ролю сацыялістычнага лагера, асабліва СССР, які адкрыў перад намі шырокія магчымасці для іх здзяйснення. Напрыклад, толькі ў адным Судане працуе больш 1500 спецыялістаў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю у Савецкім Саюзе.

Перад нашай моладдзю стаяць і іншыя задачы, якія маюць чыста унутраны характар, напрыклад, барацьба супраць сярэдневяковых традыцый. Гэтае пытанне асабліва цяжкае, паколькі яно звязана з рэлігіяй.

Для больш паспяховага развіцця краіны сілы нашай моладзі павінны быць накіраваны на пераўтварэнне эканомікі.

Трэба сказаць, што усе маладзёжныя арганізацыі на Афрыканскім кантыненце падтрымліваюць сяброўскія сувязі з рознымі арганізацыямі моладзі свету. Яны з'яўляюцца членамі міжнароднай студэнцкай арганізацыі. З кожным днём растуць і мацнеюць іх сувязі з моладдзю Савецкага Саюза, з камсамолам, які заўсёды дапамагаў нам і працягвае аказваць сяброўскую дапамогу.

Пашыраюцца культурныя сувязі. Нядаўна у Судане была адкрыта выстаўка, прысвечаная жыццю і дзейнасці У. І. Леніна. Моладзь Афрыкі дастойна сустрэла 100-годдзе з дня нараджэння заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

Можна з упэўненасцю сказаць, што маладзёжныя арганізацыі Афрыканскага кантынента аддадуць усе сілы прагрэсіўнаму развіццю сваіх краін, умацаванню брацкай салідарнасці.

**Е. ШАХІН (Судан),**
**студэнт юрфака,**
**намеснік старшыні савета дружбы БДУ.**

# НАПАГАТОВЕ!

Здаецца, зусім нядаўна студэнты фізічнага факультэта здавалі зімнюю сесію. Асабліва запомнілася яна нам, першакурснікам. Не было вопыту здачы сур'ёзных экзаменаў, да дрыжыкаў баяліся строгіх і непадступных выкладчыкаў, якія павінны былі вырашыць наш лес: быць студэнтам ці не. Многія з радасцю, нехта з горыччу і адчаем перажылі першае выпрабаванне.

Не паспелі мы як след адпачыць ад першых экзаменацыйных трывог і хваляванняў, а на чарзе ўжо другія...

Зараз пайшлі залікі. Практыку ў майстэрнях і тэхніку бяспекі ўжо здалі. Хвалююцца і перажываюць нашы выдатнікі Саша Блахін, Юра Сокалаў, Вольга Ляшко і Лёня Каткоўскі. Яны выдатнікі. Але гэты пачэсны тытул трэба абараніць і пацвердзіць, даказаць скептыкам, што пяцёркі ў першую сесію — не выпадковасць. А лік прэтэндэнтаў папоўніць когорту выдатнікаў значна ўзрос. Удумліва і сур'ёзна рыхтуюцца да заняткаў Мікалай Аўсенцаў, Саша Самусінава, Слава Жахнавец і іншыя, актыўна адказваюць на семінарах, высвятляюць незразумелыя або цікавыя пытанні. Былыя «хвасцісты» таксама не сядзяць на месцы, бегаюць у чытальныя залы і бібліятэкі, кансультуюцца ў прызнаных аўтарытэтаў, поўныя рашучасці пазбавіцца гэтага атавізму.

Матаналіз, фізіка і вышэйшая алгебра — усяго тры экзамены. Кожнаму не церпіцца збыць іх хутчэй і паехаць з будаўнічымі атрадамі ў Казахстан або працаваць на будоўлях Беларусі, да бурага колеру загарэць, пажыць напружана і весела.

**Л. ФІЛІПОВІЧ,**
камсорг першага курса І патока фізфака.

НА ЗДЫМКУ: залік па аналітычнай хіміі ў студэнта першага курса біялагічнага факультэта Уладзіміра Царука прымае дацэнт кафедры агульнай хіміі С. А. Мячкоўскі.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

**Наш фотакарэспандэнт Д. Чаховіч завітаў на гістфак якраз у час абароны дыпломных работ.**
**НА ЗДЫМКАХ: перад камісіяй трымае справаздачу студэнт VI курса вячэрняга аддзялення А. Юшын.**





*ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ*

# ЗАЎСЁДЫ Ў КАМСАМОЛЬСКІМ СТРАІ

— Сёння я пазнаёмлю вас з жамчужынай рускай паэзіі, паэмай «Слова аб палку Ігаравым». Яна нарадзілася ў сэрцы невядомага нам вялікага народнага паэта, усхваляванага няшчасцямі сваей радзімы і пранікнутага глыбокай да яе любоўю, — так пачаў адну з лекцый Іосіф Васільевіч Зазека, дацэнт кафедры рускай класічнай літаратуры, кандыдат філалагічных навук.

А ў заключэнне Іосіф Васільевіч расказаў аб тым, чаго не прачытаеш ні ў кнігах, ні ў вучэбных дапаможніках. Ён паказаў, як аўтар «Слова» праз стагоддзі працягваў нам руку ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У аудыторыі прагучаў урывак з паэмы «Нашэсце» невядомага партызанскага аўтара, напісанай па матывах «Слова аб палку Ігаравым». Паэма друкавалася ў партызанскай прэсе.

Ужо многа год Іосіф Васільевіч па крупіцах збірае мастацкую спадчыну беларускіх партызан. Ім апублікаваны даследаванні на гэту тэму ў газетах «Звязда» і «Літаратура і мастацтва», часопісах «Камуніст Беларусі», «Полымя», «Беларусь». Большасць вершаў, паэм і частушак, якія ўвайшлі ў зборнік «Лясныя песні», расказвае аб гераічных справах камсамольцаў і моладзі. Але, я думаю, не менш цікавым было б для чытача жыццё самога аўтара. Яны б дазналіся аб тым, як былы патомны батрак з глухамані, што за Беразіной, стаў вучоным і пісьменнікам.

...У ціхі сонечны жнівеньскі дзень 1914 года ў маёнтак Максімавічы стражнік прывёз тэрміновую дэпешу, дзе паведамлялася аб пачатку першай сусветнай вайны. З панскага маёнтка, хутароў пагналі ў воласць батракоў і сялян. Сярод іх быў і бацька Іосіфа, Васіль Васільевіч Зазека.

Хлопчык кінуўся да бацькі, моцна абхапіў яго за шыю.

— Ідзі да дзеда, — сказаў Васіль Васільевіч, — слухайся яго, ты ўжо вялікі. Калі з вайны не вярнуся, сам на сябе зарабляй, каб ніхто цябе не папракнуў за чужы кавалак хлеба.

Бацька вярнуўся праз тры гады, заняўся цеслярствам, а сына аддаў у пастухі да кулака. А хутка Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ускалыхнула самыя глухія мясцы Беларусі, падняла бедната на барацьбу за свае правы, за зямлю, за новае шчаслівае жыццё.

Неяк у вёску прыехалі бальшавікі. Тыя самыя, што скінулі цара і прагналі генералаў і памешчыкаў. Яны былі адзеты ў салдацкія шынялі, якраз у такія, якую насіў, вярнуўшыся з фронту, бацька Іосіфа, і ў скураныя курткі з чырвонымі бантамі. У вёсцы стыхійна ўзнік мітынг, на якім сяляне аднадушна прагаласавалі за Савецкую ўладу. Васіля Васільевіча Зазеку выбралі дэпутатам у Савет, і чырвонаармейцы прыкалолі да яго шыняля чырвоны бант.

Праходзілі дні, тыдні, месяцы. Летам 1920 года ў сяле Сяліба, якое стаіць на беразе ракі Беразіна, была створана камсамольская ячэйка. Іосіф Зазека быў у ліку першых камсамольцаў. На сход ён прыйшоў з чырвоным бантам на грудзях, тым самым, што чырвонаармейцы падарылі яго бацьку.

У Беларусі тады было неспакойна. Па вёсках і хутарах шнырылі банды белых, зялёных і іншых масцей. Яны забівалі камуністаў, камсамольцаў, сельскіх актывістаў, палілі будынкі сельсаветаў. Для барацьбы з бандамі і контррэвалюцыяй у рэспубліцы ствараліся атрады часцей асобага назначэння. Чатырнаццацігадовага іосіфа Зазеку камсамольская ячэйка накіроўвае ў Чэрвеньскі ЧАН. Там ён вучыцца страляць з вінтоўкі і кулямёта, далёка і трапна кідаць гранату. Дарэчы, быў ён тады моцным, шыракаплечым і дужым хлопцам.

Пасля службы Зазека вярнуўся да бацькі. Яны атрымалі надзел зямлі і першымі пабудавалі хату ў адкрытым полі. Цяпер там вырасла вялікая прыгожая веска Барсучына. Калі гаспадарка была арганізавана, Іосіф зноў акунуўся з галавой у камсамольскую работу, быў выбран сакратаром сельсавета вёскі Несяты. На гэтым пасту ён зразумеў, што барацьба з ворагамі маладой Савецкай Рэспублікі яшчэ далёка не закончана, і зноў узяў у рукі зброю. Але на гэты раз не вінтоўку, а пяро селькора бабруйскай газеты «Камуніст» і яе сатырычнага дадатка «Раешнік». Заметкі, падпісаныя псеўданімам «Язэп Чаромуха», білі кулакоў, сабатажнікаў і зладзеяў. Зімой 1926 года кулакі двойчы стралялі ў маладога селькора.

Праз некалькі гадоў Іосіф Васільевіч прыехаў у Мінск. Працаваў у выдавецтве «Прыбой» распаўсюджвальнікам друку, а затым у Смалявічах інструктарам райвыканкома. Там на працягу чатырох гадоў ён выбіраўся членам бюро райкома камсамола, там і ўступіў у рады Камуністычнай партыі. У 1931 годзе ў жыцці Іосіфа Васільевіча адбыліся важныя падзеі: ён паспяхова закончыў падрыхтоўчыя курсы і паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт. Збылася даўняя мара! А праз год яго адазвалі з універсітэта ў распараджэнне ЦК ВЛКСМ і накіравалі палітработнікам у пагранічны атрад. Калі ён ехаў на граніцу, у яго чамадане ляжаў экзэмпляр яго першай кнігі «Рукою ворага».

Складанае і трывожнае жыццё на пагранічнай заставе. Палітработніку Іосіфу Зазеку не раз даводзілася падымацца ноччу па трывозе і прымаць удзел у затрымцы лазутчыкаў. Дапамагала загартоўка, атрыманая ў атрадзе ЧАНа.

А затым — вяртанне ва універсітэт. Тут ён атрымаў вышэйшую філалагічную адукацыю, закончыў аспірантуру. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны І. В. Зазека быў накіраван у Беластоцкі педінстытут намеснікам дырэктара па вучэбнай і навуковай рабоце. Там яго і застала вайна.

...Канец чэрвеня 1941 года. Віхура вайны з вялізнай сілай кацілася на Усход. Туды ж трымаў шлях І. В. Зазека разам з іншымі работнікамі педінстытута, але фронт абагнаў іх. Восенню 1941 і зімой 1942 года, жывучы ў Ваўкавыскім раёне, Іосіф Васільевіч актыўна працаваў у падполлі, а ў сакавіку 1943 года пайшоў у партызанскі атрад імя С. М. Кірава, які базіраваўся ва урочышчы Гута-Міхалін, недалёка ад Белавежскай пушчы. Вось тады Зазека і пазнаёміўся з камандзірам дэсантнай разведвальна-дыверсійнай групы «Дальнія» чэкістам М. А. Хмелеўцавым. Дапамог яму устанавіць сувязь з беластоцкімі падпольшчыкамі. Былыя студэнты педінстытута сталі партызанскімі сувязнымі.

За заслугі ў развіцці партызанскага руху на тэрыторыі Польшчы І. В. Зазека ўзнагароджан урадам Польскай Народнай Рэспублікі ордэнам «Партызанскі крыж».

І ў гады вайны Іосіф Васільевіч не пакідаў літаратурнай і журналісцкай дзейнасці. У 1943-44 гг. ён рэдагаваў падпольную газету «Свислочская правда».

У пасляваенныя гады выходзяць зборнікі апавяданняў Іосіфа Васільевіча «Партызанскія сцежкі» і «Лясныя сябры», а нядаўна — «Сонечны алень». Юныя чытачы добра ведаюць яго апавяданні ў часопісах «Вясёлка» і «Бярозка».

Нядаўна ў Мінску і Варшаве быў выдадзен зборнік успамінаў польскіх і беларускіх партызан. Адну з глаў гэтага зборніка напісаў Іосіф Васільевіч.

Далёка ўжо не камсамольскі ўзрост у дацэнта Іосіфа Васільевіча Зазекі, але ён можа заслужана ганарыцца тым, што ўжо 50 год ідзе ў страі першых камсамольцаў нашай краіны.

**В. ГРУЗДЗЕЎ,**
**студэнт журфака.**



# СВЯТА БРАТНЯГА НАРОДА

**21 мая ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны Дню балгарскай культуры, асветы і славянскай пісьменнасці. З уступным словам выступіў член праўлення Беларускага аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы дацэнт Д. Б. Мельцар. Аб свяце брацкага балгарскага народа, яго дасягненнях у галіне культуры і літаратуры, аб супрацоўніцтве, сувязях беларускіх і балгарскіх пісьменнікаў зрабіў даклад дацэнт кафедры беларускай літаратуры, кавалер ордэна Кірылы і Мяфодзія Н. С. Гілевіч.**

Да Дня балгарскай культуры, асветы і пісьменнасці ва універсітэцкай бібліятэцы арганізавана кніжная выстаўка, якая расказвае аб дасягненнях Балгарыі у культурным будаўніцтве.

Другая выстаўка, у асноўе якой ляжаць фатаграфіі, знаёміць студэнтаў з дасягненнямі брацкага балгарскага народа ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і асветы. Яна размешчана на трэцім паверсе галоўнага корпуса.



## КАРЫСНЫ АБМЕН

*Кожны год наш універсітэт атрымлівае вялікую колькасць кніг і часопісаў з Балгарскай Акадэміі навук, Плоўдзіўскага вышэйшага педагагічнага інстытута, Сафійскага універсітэта. Гэтыя установы дасылаюць цікавую літаратуру па матэматыцы, фізіцы, хіміі, геаграфіі, філалогіі і іншых галінах навукі.*

*У сваю чаргу наша бібліятэка дасылае балгарскім усе чатыры серыі «Весніка БДУ», падручнікі па замежнай мове і літаратуры, кнігі па грамадска-палітычных пытаннях, вылічальнай тэхніцы і шмат іншых.*

**НА ЗДЫМКУ:** у час візіту ў наш універсітэт загадчык кафедры фізічнай геаграфіі Балгарыі і кантынентаў Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага Ілья Іванаў Хрыстаў (справа) абмяркоўвае планы навуковага супрацоўніцтва з загадчыкам кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін БДУ прафесарам В. Р. Заўрыевым.

**В. ЗАЎРЫЕЎ**

## СПЯТ НА ШИПКЕ...

Спят на Шипке
Сном последним
Славные герои.
То дождями
Их обмоет,
То туман накроет.
Рядом с русским
Спит болгарин —
Верные друзья.
Средь камней
Вдали от дома;
Их забыть нельзя.
И идут к ним
На Планину
Каждый новый день,
Чтобы в ноги
Поклониться,
Тысячи людей.
Видел я
Войну и горе,
Кто их не видал,
Средь погибших
Армянина
Имя отыскал.
Где ты, где,
Земля родная,
Где родимый край?
Расступись,
Скала сырая,
Джан, скорей вставай.
Шепчет тихо,
Словно брату,
Маленький ручей.
На отчизну
С облаками
Унесет борей.
Дома встретит
Мать-старушка,
Алагез седой,
Ждет тебя
В селе пирушка
С чаркою, другой.
Нет, не встанет он,
Не может.
Вечно будет спать,
А домой
С могилы камень
Просит передать.
Шипка, 28.IX.1967 г.

## Песня пра Вялікае перасяленне

**Дзімітр МЯТОДЗІЕЎ — выдатны балгарскі паэт і грамадскі дзеяч, лаўрэат Дзімітраўскай прэміі. Працуе ў ЦК Балгарскай кампартыі і з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса «Наша Родина». Ім выдадзена звыш дзесяці кніг вершаў і паэм, а таксама раман у вершах «Дзімітраўскае племя». Паэзія яго вызначаецца баявой партыйнай накіраванасцю, вострай публіцыстычнасцю, эмацыянальнай напружанасцю, яркай, вобразнай мовай. Д. Мятодзіеў вядомы ў Балгарыі і як перакладчык. У яго перакладах выйшаў «Кабзар» Т. Шаўчэнкі, паэмы А. Твардоўскага і інш. Пераклаў ён і некаторыя творы беларускіх паэтаў. Некалькі гадоў назад Д. Мятодзіеў быў госцем беларускіх пісьменнікаў у Мінску. Паэма «Песня пра Вялікае перасяленне» была апублікавана нядаўна ў органе ЦК БКП—газеце «Работническо дело». Ніжэй друкуецца урывак з гэтага твора, перакладзенага дацэнтам нашага універсітэта паэтам Нілам ГІЛЕВІЧАМ.**

Трудная бітва за ход гісторыі.
У палітыцы, у эканоміцы і ў
тэорыі —
на скрыжаванні шляхоў
чалавечых—
схапілі за горла адзін аднаго
ворагі непрымірымыя, вечныя;
Праца і Капітал.
Хто — каго?..
Ад напружання
на арбіце хістаецца
куля зямная,
вагаецца
клімат планеты
між зімою і летам,
Хто — каго?
Яшчэ намаганне—і вось нам
наглядна—
Застаўкі векавыя ляцяць да
д'ябла!
Пад напорам, знямоглая,
рушыцца дэмагогія!
Нічога не зробіш — Капітал-
жываглот
з Дэмакратыяй мусіць узяць
развод!
Другая мадам
дастае ўжо са скрыні вэлюм—
не ўпершыню ёй на гэта рашыцца!
І зноў Капітал — старая шэльма—
у шлюб уступае з чумой
фашысцкай.
«Блаславёны бог наш...»
— Бягом... марш!
І курчыцца асфальтавая скура
гарадоў
пад гусеніцамі танкаў,
у смуродным дыме.
І чэргі кулямётныя ізноў,
як рупныя за працай гаспадыні,
жнуць сялянскія нівы.
Жыва!
Без цырымоній і без фантазіі —
усе па адзінаму ўзору — а ну!—
Еўропа, Амерыка, Афрыка, Азія,
падстаўляйце спіну!
І садзяць генералы
шпоры жалезныя
у рэбры Гватэмалы,
у сэрца Інданезіі.
Ад высокага гонару азвярэлая,
хоча п'яная банда зямлю
зацугляць.
І капае пена,
кроўю ускіпелая,
з вуснаў вуліц разбітых,
што ад болю смыляць...
Гэй, ваўкі!
Іх няма ўжо — ягнятак
безабаронных:
«замучу ці не замучу — а з'ем я
цябе!»
Увесь у крыві, у пажарах,
смяротных,
В'етнам загартоўваецца ў
барацьбе!
Босая і голая
змагаецца Ангола!
Акружаная акіянам
пагроз пастаянных,
бязбоязна —
з рэвальверам за поясам —
маладая, вясёлая, белазубая, —
над Паўднёвай Амерыкай зоркаю
ззяе Куба!
Сусветныя жандары, лютуеце
дарэмна,
скончыўся ваш час!
Сіла супраць сілы!
Улада—супраць улады!
Сусветная сацыялістычная сістэма
бясстрашна
ідзе
супраць вас.
Не натоўпы
абуранай вамі публікі,
не маўклівыя сведкі з нямымі
дакорамі —
мы з Саюзам Савецкіх
Сацыялістычных
Рэспублік
прыводзім у выкананне
прысуд гісторыі!
І трашчыць,
і лопаецца буржуазная карта.
І ідзе
за Леніным
баявы авангард —
па усіх франтах, непахісна і
упарта,
і Зямля набывае класавы гарт,
Зямля разрывае аковы рабства
і — гнеўнай чырвонай лавінай —
за Леніным
у наступ ідзе —
па свабоду і брацтва.
У вялікае наступленне!..

Матэрыялы старонкі падрыхтаваны Беларускім аддзяленнем таварыства савецка-балгарскай дружбы універсітэта.

*НА ЗДЫМКАХ: Сафія. Сабор Аляксандра Неўскага; манумент, узведзены ў гонар Савецкай Арміі-вызваліцельніцы; на Шыпцы— група студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.*

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

● У канцы 1968 года насельніцтва Народнай Рэспублікі Балгарыі дасягнула 8.401.000 чалавек. У тым жа 1968 годзе ў школах навучалася 1.500.000 вучняў. У вышэйшых навучальных установах—80.248 студэнтаў, у той час як у 1939 годзе іх было 10.169.

● У розных галінах народнай гаспадаркі працавала 148.821 чалавек з вышэйшай адукацыяй і 317.308 чалавек з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

● Павялічылася колькасць тэатраў: у 1939 годзе іх было усяго толькі 13, у 1968 — 39. У 19 разоў у параўнанні з 1939 годам павялічылася колькасць кінатэатраў.

● На 10.000 жыхароў Балгарыі цяпер прыхсдзіцца 18 урачоў і 4 стаматолагі. У 1939 годзе на тую ж колькасць жыхароў — 5 урачоў і 2 стаматолагі.

● Штогод кінатэатры Балгарыі наведваюць 36.000.000 чалавек. У 1944 годзе наведвальнасць кінатэатраў была 13.000.000. 73 балгарскія фільмы ўдастоены 125 міжнародных узнагарод.

● У Балгарыі цяпер 13.841 калектыў мастацкай самадзейнасці, якія налічваюць амаль паўмільёна удзельнікаў. Лік самадзейных хароў — 6.317, самадзейных аркестраў — 1.500, звыш 3.000 самадзейных тэатральных калектываў.









# ФІЛЬМ ПРА БЕААРУСКАГА ПЕРШАДРУКАРА

У дні Усесаюзнага кінафестывалю беларускую кінематаграфію прадстаўлялі фільмы «Іван Макаравіч» і «Я, Францыск Скарына».

Перад аўтарамі апошняга стаяла складаная задача — узнавіць вобраз гістарычнай асобы. Дасягнуць гэтага нельга без раскрыцця важнейшых рыс характару героя, канкрэтных яго учынкаў. Да таго ж і гістарычная эпоха, у якую жыў Скарына, патрабавала да сябе увагі.

Выступаючы перад прэм'ерай у Доме кіно Саюза кінематаграфістаў БССР, рэжысёр-пастаноўшчык Б. Сцяпанаў падкрэсліў, што творчы калектыў перш за усё імкнуўся паказаць апантанасць Скарыны ідэяй асветы, якая і кіравала усімі учынкамі героя. У фільме не цяжка заўважыць гэтую апантанасць. З першага паяўлення на экране і да апошніх кадраў Скарына імкнецца да ведаў, да дзейнасці у імя прагрэсу, верыць у сілу розуму і рашуча абараняе гэту веру. Шкада толькі, што узровень «ідэйнага бою», які паказан у фільме, невысокі. Менавіта у тлумачэнні філасофскіх поглядаў больш за усё праявіўся недастаткова глыбокі характар драматургічнай асновы фільма. Гэта значна панізіла пераканаўчасць эпізодаў у Кракаўскім універсітэце, дзе Францыск Скарына атрымаў вучоную ступень.

Фільм сведчыць, што рэжысёр, драматург, акцёр не імкнуліся прадставіць Скарыну як строгага вучонага мужа. Яны надзялілі свайго героя бурным тэмпераментам, уважлівасцю. І таму ён па-чалавечы блізкі нам. Але у той жа час адчуваеш, што герою не хапае значнасці. Няма фактычна у фільме велічнай асобы беларускага першадрукара як вучонага-гуманіста і патрыёта-асветніка, няма Беларусі першай паловы XVI стагоддзя, без якой цяжка уявіць сабе героя. Але ж кнігавыдавецкая дзейнасць Скарыны — вынік грамадскага развіцця тагачаснай Беларусі. Скарына стаў першадрукаром, таму што гэтага вымагала эпоха. У фільме ж справа, за якую узяўся Скарына, выглядае амаль выпадковай для яго.

Праз пярэчанні, перашкоды зноў і зноў сочыш за экранным дзеяннем. Бярэ сваё прафесіянальная работа не толькі рэжысёра, але і аператара В. Нікалаева. Многія сцэны і эпізоды па-мастацку перадаюць дух эпохі (напрыклад, сцэна сонечнага зацьмення).

Удалым у карціне з'явіўся і вельмі эмацыянальны эпізод, калі Скарына пачынае друкаваць першую кнігу. А у артыста Алега Янкоўскага гэта, напэўна, найлепшы момант ва ўсёй стужцы.

Рэжысёр, аператар, а таксама мастак шукалі магчымасці і сродкі стварыць каларыт эпохі, падкрэсліць своеасаблівасць вобразаў. І увогуле ім гэта ўдалося. З энтузіязмам працавалі над сваімі ролямі і акцёры. Але з выбарам выканаўцаў не заўсёды можна пагадзіцца. Больш за усіх пераконвае артыст Г. Карка у ролі манаха.

Пры усіх заўвагах новая праца нашых кінематаграфістаў, узняўшых такую важную для нацыянальнага мастацтва тэму, вартая павагі.

*Л. КАРПІКАВА.*

*Студэнта факультэта журналістыкі А. Елісеева прыцягвае спартыўная тэма. Мужнасць і прыгажосць, прагу да перамогі, напал спартыўнай барацьбы ён стараецца найбольш выразна адлюстраваць у сваіх здымках.*

*Сёння мы прапануем чытачам дзве фотаработы А. Елісеева.*



# ФЛЮГЕР

*ГУМАРЭСКА*

Адразу пасля заканчэння зімняй сесіі у адной з аудыторый інстытута праходзіла пасяджэнне стыпендыяльнай камісіі. Яе члены, з заклапочанымі і стомленымі выразамі на тварах, некалькі гадзін без перапынку спрачаліся аб вызначэнні той долі грошай, якая павінна стаць для кожнага студэнта сродкам матэрыяльнага існавання на цэлы семестр.

— Наступны Натан Верабей, —пільна ўглядаючыся у вялізны спісаны аркуш паперы, каб не прапусціць чыё-небудзь прозвішча, спакойна аб'явіў намеснік дэкана.

Адным з першых на яго словы адклікнуўся пісклівы сакратар камсамольскай арганізацыі Бора Поўны:

— Яно відней старасту: даць Натану стыпендыю ці не. Гэта ж студэнт з ягонай групы.

Закалотка, староста курса, важна акінуў позіркам прысутных, якія абыякавата глядзелі перад сабой. Значыць, справа залежыць ад яго. Закалотка даўно вастрыў зуб на Вераб'я: дужа многа языком меле і не жадае яго, выбранніка курса, прызнаваць за кіраўніка. Замест старасты часта кліча солтысам, навучыў і іншых, каб наракалі такой гадкай мянушкай. Ліха яго вазьмі, пры прапанове «адказаць» —горш будзе, Натан яшчэ нюхаўку расквасіць.

— Трэба было даць.

Пасля нечаканага маўчання ўстаў сівагаловы куратар Іосіф Сяргеевіч Апякун. Чыхнуўшы разы са тры над сваей насавой хусцінкай, ён звярнуўся адразу да усіх:

— Выбачайце, калі ласка, я маю некалькі слоў. Стыпендыю мы вызначаем у першую чаргу тым, хто мае добрую паспяховасць. А яна у Вераб'я не надта важная. Нават адна тройка у хлапца па дыялектычнаму матэрыялізму. І я маю рацыю, калі скажу «адказаць».

Цяпер Закалотка асмялеў. Калі што-небудзь — віну перад Натанам можна ўскласці на куратара.

— Тады і я супраць! — адказаў ён.

— Не, сябры, — запішчаў сакратар камсамольскай арганізацыі Поўны, — у Натана сямейныя абставіны прымушаюць аказаць яму дапамогу. У дадатак да гэтага ён някепскі таварыш на курсе, ветлівы, без адмовы выконвае грамадскія даручэнні. Я галасую за тое, каб даць яму стыпендыю!

— Калі так, то і я падтрымліваю голас Поўнага. — Далей Закалотка разважаў: «Сакратар, ён вышэй куратара. Апошнія штосьці зараз на курсе затрымліваюцца мала. Варта цягнуцца за першым».

— Пачакайце, — узлаваўся намеснік дэкана, — Натан Верабей не толькі спазняецца на лекцыі, але часам прапускае іх. За такое не шкодзіла б гнаць з інстытута.

«Дэканату неабходна дагаджаць, як нікому, — працягваў разважаць сам з сабой Закалотка. — Адны з нас прыходзяць у інстытут, другія, атрымаўшы дыплом, пакідаюць яго. А дэканы з намеснікамі былі, ёсць і будуць. Не маючы грашкоў, іншыя аж да самай пенсіі не сходзяць са сваіх пасад, хіба толькі хто павышэнне атрымае і пяройдзе на другую працу. Вось цяпер я адпомшчу Натану. Хай толькі заікнецца, то...»

— Гнаць яго! — з суровым выразам закрычаў Закалотка.

— Адкажам яму!

— Таварышы, — раптам звярнуўся загадчык кафедры фізічнага выхавання Адам Рыгоравіч Круцікаў, які дасюль увесь час маўчаў,—мы ж яшчэ не страцілі свайго сумлення, каб не даць стыпендыю Вераб'ю. Вы добра павінны ведаць, што толькі Натан цягне наш факультэт у спаборніцтвах па стральбе з лука. Мы знімем у яго стыпендыю, а ён адмовіцца больш выступаць, і прызавога месца нам ужо не бачыць.

— Ага, — падтрымлівае куратар і зноў чыхае у сваю хусцінку.

— Трэба даць, — пішчыць Бора Поўны.

«Дазваляю» — супраць прозвішча Вераб'я выводзіць намеснік дэкана.

Староста крыху чырванее ад злосці, але, каб не быць заўважаным, робіць вымушаную усмешку, маўляў, і ён разам з усімі.

**М. ДАМАРАД.**

● СПОРТ ● ● СПОРТ ● ● СПОРТ ●

## НАВІЧКІ СТАЛІ РАЗРАДНІКАМІ

**У пачатку мая у Ялце адбылося першынство Мінскага савета ДСТ «Буравеснік» па спартыўным лазанні. Прымала ўдзел у гэтых спаборніцтвах і каманда універсітэта. У яе складзе былі у асноўным навічкі, для якіх усё тут было упершыню: і скалы, якія на першы погляд здаваліся непрыступнымі, і адчуванне вышыні, і сама атмасфера спаборніцтваў. Тым не менш каманда БДУ выступіла паспяхова. Яна заняла II месца, уступіўшы першынство медыкам. Скалы аказаліся не такімі ужо непрыступнымі.**

**На класіфікацыйных спаборніцтвах, якія былі праведзены перад ад'ездам, амаль усе навічкі з каманды універсітэта выканалі норму III спартыўнага разраду. Поспех гэта ці не? Думаю, што двух меркаванняў наконт гэтага быць не можа.**

Г. КІСЯЛЁЎ,
удзельнік спаборніцтваў,
студэнт філфака.

## ВІНШУЕМ З ПЕРАМОГАЙ

На праішоўшым першынстве вну рэспублікі па баскетболу жаночая каманда універсітэта заняла першае месца (трэнер Г. Грудо). Віншуем дзяўчат са званнем чэмпіёнаў!

Нядрэнных поспехаў дасягнула і мужчынская каманда баскетбалістаў, якая заняла ў спаборніцтвах трэцяе месца.

**В. МЯДЗІЧ.**

## МАЦНЕЙШЫЯ — МАТЭМАТЫКІ

**Два дні на стадыёне «Дынама» спаборнічалі лёгкаатлеты універсітэта. На старт выйшлі прадстаўнікі васьмі факультэтаў. Мацнейшай аказалася каманда матэматычнага факультэта, другое месца заняла каманда фізфака, трэцяе — гістфака. Далей ідуць каманды філфака, біяфака, хімфака, журфака і геафака. Юрыдычны факультэт каманду не выставіў.**

* * *

Закончылася першынство БДУ па мастацкай гімнастыцы. Першае месца заняла каманда матэматычнага факультэта, другое — хімфака, трэцяе — біяфака, чацвёртае — фізфака, пятае — геафака, шостае — юрфака.

**В. БАРЫШНІКАВА.**

● СПОРТ ● ● СПОРТ ●

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 09228. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 715